# Новы ўзровень кніжнага супрацоўніцтва

**У Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь адбылася ўрачыстая перадача кніг Выдавецкага дома «Звязда» ў Кітайскі цэнтр кнігі.**

Падарунак ад Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь і Выдавецкага дома «Звязда» ўручыў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч.

— Кнігі, якія мы сёння перадаём у фонд «дыямента ведаў», выдадзены пераважна пасля 2013 года. Наша выдавецтва зацікавілася кітайскай літаратурай яшчэ ў 2012 годзе, пачынаючы з кнігі перакладаў на беларускую мову лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Мікалая Мятліцкага. Кніга «Пад крыламі дракона» была выдадзена тыражом 2000 асобнікаў і мела каласальны поспех. Пазней мы сталі выпускаць серыю «Светлыя знакі: паэты Кітая». Усяго выйшла 14 кніг — 13 аўтарскіх і адзін зборнік перакладаў кітайскай паэзіі народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна. Мы апублікавалі творы найбуйнейшых класікаў кітайскай літаратуры — Лі Бо, Ван Вэя і іншых, — расказаў пра «кітайскую» гісторыю выдавецтва Алесь Карлюкевіч.

Перададзеныя бібліятэцы творы не абмяжоўваюцца адной тэмай. Тут ёсць кнігі пра літаратурна-гуманітарныя сувязі паміж Беларуссю і Кітаем, ёсць творы, прысвечаныя пытанням гісторыі і дзяржаўнага ладу.



Беларуская літаратура таксама цікавіць жыхароў Паднябеснай. За апошнія два гады было выдадзена тры кнігі беларускіх аўтараў на кітайскай мове. «Саюз пісьменнікаў Беларусі разам з Выдавецкім домам "Звязда" спрабуе сфарміраваць бібліятэку на беларускай і рускай мовах, прысвечаную беларускай літаратуры», — падзяліўся старшыня СПБ Алесь Карлюкевіч.

Намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Віктар Пшыбытка падкрэсліў, што калекцыя, якая штогод папаўняецца, дае магчымасць чытачам пазнаёміцца з кітайскай культурай.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**
**Фота Кастуся ДРОБАВА**